# У ВЯНОК ПАЭТУ

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# Я ПАМЯТНИК СЕБЕ ВОЗДВИГ НЕРУКОТВОРНЫЙ...

*Рыгор Барадулін*

Exegi monumentum*

Узвысіў помнік я сабе нерукатворны,
Не зарасце к яму людская сцежка дзён,
Вышэй узнёсся галавою непакорны
За стоўп Александрыйскі ён.

Не, ўвесь я не памру — душа ў жаданай ліры
Мой прах перажыве, тлен не збаіцца пліт, —
І ў славе буду я, пакуль пад небам шчыры
Жыць будзе хоць адзін пііт.

Маё імя памкне ў прасцяг Русі вялікі,
І звыкне да яго, калі яшчэ не звык,
І горды ўнук славян, і фін, і покуль дзікі
Тунгус, і стэпаў друг калмык.

І доўга буду тым прыязны я народу,
Што лірай добрыя пачуцці абуджаў,
Што ў мой няўмольны век уславіў я свабоду
І літасць да нябог гукаў.

Пачуй, о муза, слова боскае з пашанай,
Не бойся крыўды ты і пра вянок не дбай;
Паклёп і пахвалу прымай з душой рахманай
І ў спрэчку з дурнем не ўступай.

*1987*

* Я ўзвысіў помнік (*лац.*)

*Васіль Зуёнак*

Exegi monumentum*

Сабе я помнік сам узвёў нерукатворны,
Людская сцежка да яго не зарасце,
Ён над стаўпом Александрыйскім непакорна,
  Як покліч неба, узляцеў.

Не, не памру я ўвесь — у запаветнай ліры
Душа перажыве мой прах, мой тленны свет, —
І слынны буду я, пакуль зямным кумірам
  Жыць будзе хоць адзін паэт.

І пройдзе розгалас па ўсёй Русі вялікай,
І назаве мяне шматмоўны пераклік —
І горды ўнук славян, і фін, і зараз дзікі
  Тунгус, і стэпаў друг калмык.

І любы доўга буду я свайму народу,
Што лірай добрыя пачуцці абуджаў,
Што ў жорсткі, люты век уславіў я свабоду
  І грэшным літасці жадаў.

Наказу боскаму, о муза, будзь слухмянай,
Не патрабуй вянка і крыўдзе не ўступай,
Паклёп і пахвалу прымай, як лёс нязваны,
  І з дурнем спрэчак не ўчыняй.

*1987*

* Я ўзвёў помнік (*лац.*)

*Максім Танк*

Я помнік збудаваў сабе нерукатворны,
Не зарасце людская да яго трапа,
Вышэй чалом сваім ён ўзняўся непакорным
Александрыйскага слупа.

Не, я ўвесь не памру — у ліры застанецца,
Прах перажыўшы мой, душы пявучы дар, —
І слаўны буду я, пакуль на цэлым свеце
Жыць будзе хоць адзін пясняр.

Вядомы буду я на ўсёй Русі вялікай,
І імя маё кожны назаве язык,
І горды ўнук славян, і фін, і сёння дзікі
Тунгус, і стэпаў друг калмык.

За гэта доўга буду любы я народу,
Што лірай лепшыя надзеі абуджаў,
Што ў мой суровы век праславіў я свабоду
І міласць да няшчасных зваў.

Загаду божаму, о муза, будзь слухмянай,
Не бойся крыўды, лаўраў не жадай,
Не пераймайся славай і хлуснёй паганай
І ў спрэчцы дурня не чапай.

*1937*

*Эдзі Агняцвет*

## ПУШКІНСКІЯ КРЫНІЦЫ

### 1. 6 жніўня 1824 года

Я веру, што ў Міхайлаўскім самотным,
Над белым, як зіма, маладзіком,
Ён згадваў шлях,
і жнівень незваротны,
І шчыры, светлы горад над Дняпром.

Ён помніў —
побач цокалі падковы,
Здалося, узлятаў ён на вятрах —
Па вуліцах зялёных Магілёва
Яго насіла моладзь на руках.

Ад радасці шалела наваколле,
Насустрач беглі з кожнага двара.
Усё было: паэзія, прыволле,
Ў паветры шапкі,
воклічы "ура!"

І падалі антонаўкі са звонам,
Каціліся каменьчыкі на дно.
Такім шчаслівым,
вольным і натхнёным
Паэт не адчуваў сябе даўно.

Няхай яму на пошце не ўдалося
Заначаваць у летняй цішыні, —
З сабой павёз ён рэха шматгалосся
У жорсткі век — амаль неверагодны —

І ласку чалавечай цеплыні.
Быў у выгнанні Пушкіна прамень,
Было адно: людзям ён неабходны,
Яму свяціў і той кароткі дзень.

### 2. Арына Радзівонаўна

Ты махнула палатнянай хусткаю,
Ціхая ў трывозе і журбе...
Ёсць у нас жанчыны беларускія,
Блізкія душою да цябе.

Іх любоў няшумная, нябачная
Ратавала раненых байцоў,
Як твая, нягаснучая, матчына,
Ратавала Пушкіна
любоў.

Вось твая святліца непрасторная,
Дзе ўдыхаў прастор жыцця Паэт.
Вераценца,
посцілка узорная —
Твой сялянскі запаветны свет.

Тут — пакуты,
клопаты будзённыя,
Што на твар баразнамі ляглі...
Добры дзень, Арына Радзівонаўна,
Казачніца пушкінскай зямлі!

У лясной глушы, калючай сцюжаю
Ты адна з ім падзяляла боль.
Родная, гаротная і мужная,
Пакланіцца, маці, ты дазволь —

Ад радзімы ўсёй маёй вялікае,
Ад грузінскіх незамглёных гор,
Ад прыволля стэпавай Калмыкіі,
Ад пявучых беларускіх зор!

### 3. Пушкінскія Горы. 1944

*Аляксею Русецкаму*

І чад ішоў ад кручаў і палян,
Дыміліся і дрэвы, і пракосы.
Глядзеў на свет маўклівы капітан,
Як наша Беларусь, русавалосы.

Шалёны свет!
Чарнеў дзікунскі след
Той ненавіснай, самай лютай сілы:
Міхайлаўскае, спаленае ўшчэнт,
І міны каля пушкінскай магілы.

"Адкуль знайшліся ў Гётэ землякі,
Аглухлыя, аслеплыя ад злосці?"
Палалі на палотнішчы радкі
І клікалі:
"За Пушкіна адпомсцім!"

І рукі абгарэлыя ялін
Цягнуліся да сэрца капітана.
Усё згадаў за некалькі хвілін:
Маленства казкі,
першы ліст Таццяны.

Мужчыны рэдка плачуць на вайне,
І ён не плакаў, трыццацігадовы...
Цяпер прыходзяць да яго ў сне
Старыя запаветныя дубровы.

Ён помніць Святагорскі манастыр,
Разбітую званіцу і завалы.
...Ішла вайна за Пушкіна,
за мір,
Ішла вайна за родны дом Купалы.

### 4. Самым маладым

Дубровы пушкінскага краю,
Любоў крыніцы і агню!
Я зноў увосень адкрываю
Усё,
нібыта ўпершыню.

Зноў пакланюся ў звонкай цішы
Празрыстым трапяткім радкам,
Прысвечаным жанчынам іншым —
Багіням,
а не грэшным, нам.

У век наш атамны, ракетны
Яшчэ на свеце ёсць любоў.
Яна чакае ад паэтаў
Нясцёртых, першародных слоў.

Хай вам гарачы лёс юначы
Дасць сэрца зоркае ў жыцці —
Сваю Аленіну ўбачыць
І Анну Керн сваю знайсці!

*1975–1976*



KAMUNIKAT.org

*Андрэй Александровіч*

## ШЛЯХ ВЫГНАННЯ

### Памяці А. С. Пушкіна

Я еду лесам, еду борам,
Гарыць на сонцы сіні лёд.
Лунае высака ў прасторы
Жаданых мар імклівы лёт.

Мінаюць вёрсты. Як ніколі
Раздоллем вабіць шырыня.
Прывет, аснежанае поле!
Прывет, марозны гоман дня!

Я праязджаю тым маршрутам
Праз беларускі лес — гушчар,
Якім, скаваўшы думу ў путы,
Паэта гнаў у ссылку цар.

Услед за геніем народа,
За ўзлётам гордых дум яго
Цар пасылаў таемным ходам
Жандара вернага свайго.

І між палёў, дубоў-сталетак,
Каля празрыстага Дняпра
Ляжаў выгнання шлях паэта
Па ўказу чорнага цара.

І Беларусь тады не знала,
Хто йшоў сярод яе палёў,
Бо на вачах яе ляжала
Іржа прыгонных ланцугоў.

З гор Магілёўшчыны ён бачыў
Народам выклятую даль.
Ён чуў, як край гаротны плача,
Як стогне плынь дняпроўскіх хваль.

І марыў ён — на першым дрэве
Павесіць лютага цара!
...Адначаваўшы ў Магілёве,
Далей пагналі песняра.

З тых дзён мінула ўжо стагоддзе...
Парос быллём выгнання шлях.
А песня генія ў народзе
Жыве ў раскованых грудзях!

Я еду лесам, еду борам,
Гарыць на сонцы сіні лёд.
Я сэрцам чую — над прасторам
Паэта славіць мой народ!

*1937*

KAMUNIKAT.org

*Мікола Аўрамчык*

## БАЛАДА АБ ВЫЗВАЛЕНЫМ ПАЭЦЕ

На Беларусі ёсць лясны паўстанак,
Дзе некалі ў адзін з вясновых дзён
Адбілі раніцою партызаны
Нагружаны варожы эшалон.

У партызанскім лагеры зялёным
Юнак-разведчык расказаў пазней,
Як ён знайшоў за кратамі ў вагоне
Абрабаваны пушкінскі музей.

Між даўніх кніг у вокладках са скуры,
Сярод пажоўклых выразак з газет,
З-пад рукапісаў,
з бронзавай скульптуры
Паэт прыветліва зірнуў па свет.

— Нягоднікі! — прамовіў злосна з болем
Хлапец,
падняўшы рукапісны ліст. —
З багаццем нашым Пушкіна ў няволю,
На катаргу ў Нямеччыну вязлі.

Спяшаючыся,
Пушкіна адгэтуль
Аднеслі партызаны ў лясы...
Нібыта слёзы,
на шчацэ паэта
Заззялі кроплі ранішняй расы.

Ухутаны,
пад плашч-палаткай новай,
На падасланым верасе сухім,
У засені густых галін яловых
Адпачываў ён у кутку лясным.

Між партызан аб ім хадзіла слава.
Чыталі мсціўцы
Пушкіна радкі
Аб тым, як нашы продкі пад Палтавай
Грамілі чужаземныя палкі.

А ў поўнач па чыгунцы, каля рэчкі,
Ляцеў з маста варожы эшалон,
І ўдарам партызанскім
у мястэчку
Разгромлен быў фашысцкі гарнізон.

Пазней,
калі дачуўся лес зялёны,
Што перамогі светлы дзень настаў,
Паэт з’явіўся ў гарадок раённы
І горда узышоў на п’едэстал.

Цяпер дубы расказваюць быліны,
І шэпчуць баравыя верасы
Аб тым,
як Пушкіну цяжкой часінай
Далі прытулак нашыя лясы.

*1949*

*Рыгор Барадулін*

* * *

У Пушкіна адносіны з царом
Складаныя і напаміну вартыя.
Мёд з палыном
Якой чарэпаў квартаю,
Ні расказаць, ні апісаць пяром.

Пакуль калега пыху таймаваў
І раіўся даверліва са шлункамі,
Ён аплявуху звання камер-юнкера
Радком да дзекабрыстаў адмываў.

У Пушкіна —
Прыгоннага вякоў
Адносіны са славаю дваранскія.
Сумленне толькі прызнаваў дарадцаю,
Каб дзёрзкасць падкаваць,
Шукаў цвікоў.

А быў адзін,
А першы быў паўсюль,
Упарты,
Асцярогай не прычэсаны.
І думаў,
Стаўшы пад прыцэл дантэсавы,
Што ўсіх паэтаў засланіў ад куль...
*1980*

*Рыгор Барадулін*

# ПУШКІН

## Трыпціх

### I. І туга напілася з шалома

А задоўга да чорнага дня
Ёй імя выбірала жалоба.
І туга напілася з шалома,
І згубіла сябе глыбіня.

Учарніла Расіі чало
Змрочнай стужкаю
Чорная рэчка.
Свой працяг брала
Даўняя спрэчка,
Дзе зацяліся тхло і святло.

Боль адчуў сябе гаспадаром,
І ў далёкай тады Беларусі
Зімавусы ратай схамянуўся:
Што ён,
Перад грамніцамі гром?

Ратавала замова радкоў.
Жах ляцеў груганом
З Чорнай рэчкі.
Зоркі, як памінальныя свечкі,
Ціха ўсхліпвалі ў небе вякоў.

## II. Дарога Пушкіна

Не цераз,
А праз Беларусь ляжала
Дарога Пушкіна.
І ўся яна,
Расійская прыгонніца-дзяржава,
Напятая, як поцяг бізуна,
Зацята за выгнаннікам сачыла,
Круціла шыю цяжка галава.
Мардзеў вялікахамскасці сычыла,
Пуляла вочы сытасці сава.
Выгнаннік не на вёрсты, а на нівы
Глядзеў,
Дзе шчодрыўся ўраджай пакут.
І аўтар быў яшчэ не ананімны
"Тараса на Парнасе" —
Бегаў тут.

Паэт быў свой каржакаватым хатам,
Ён заглушаў абраз змяіны сык,
Самадзяржаўнае Расіі атам
Ён расшчапіў,
"Всяк сущий в ней язык"
Пачуў.

Былой забітасці атрускі
З-пад капытоў каціліся ў равы.
І дол, і дух
І нораў беларускі
Паэт сагрэў,
Як промень яравы...

## III. Гавана.
## Доўгія вейкі здзіўлення

У атачэнні экзатычных дрэў.
Стаіць на глебе, перагрэтай скварам,
Не бронзавы — ён проста абвятрэў,
На спелым сонцы высмугліўся тварам.
Даносіць ветру зморанага ўзвеў
Пустэльні жаль, заручанай з анчарам.

І полаз не заенчыць нараспеў,
І лістапад не ўкленчыць неўскім хмарам.
Не ўстрашыць час. Ні снегу сівізна.
Ці вейкі доўгія ўзняло здзіўленне?
Ці гэта зелянееца сасна,
Дачка гаванскіх соснаў, і яна,
Як там, дзе сівярэе сінізна,
Нагадвае дзівоснае імгненне.

*1986*

KAMUNIKAT.org

*Алесь Бачыла*

## ТРЫПЦІХ ПАМЯЦІ А. С. ПУШКІНА

### Куля Дантэса

Няйнакш як рукою злою
Цябе адлівалі для зла,
Знарок рабілі такою,
Каб іншаю быць не магла.

Іншаю... Фібрамі ўсімі
Кляну цябе да хрыпаты
За тое адно, што не міма
Тады праляцела ты,
Што нават не рыкашэтам,
Крануўшы яго, загула,
А вобзем зваліла паэта...
Як ты магла?!

Знала ж: дантэсаў — зграя,
А Пушкін — толькі адзін.
Знала... І вось памірае
Ён... Сорак шэсць гадзін.

Сорак і шэсць са смерцю
Б'ецца... Згасае свет...
Кожны б гатоў памерці,
Толькі б жыў ён, паэт.
Ён!.. Бо ніхто не завершыць
Спраў, не завершаных ім.
...Вечна страляе першым
Зло, а дабро — другім...
Вечна дабра інтарэсы
Трэба сабой бараніць...
Рвецца цярпення ніць...
Будзьце ж пракляты, дантэсы!

## Неадпомшчаны боль

Маўкліва стаіць справядлівасць людская —
За смерць нічыя не паплоціцца кроў...
Нястрымна над целам паэта рыдае
Расія слязьмі Наталі і сяброў.

Рыдае.
Балючая крыўда глыбока
Ўваходзіць у рускія сэрцы, як нож...
Застыла ў здзіўленні прытворным,
Што ў шоўку,
Расія вяльмож.
Не хоча, не можа пыхлівае кодла
Уцяміць жахлівых падзей...
Яму і забойства паэта — не подласць,
І нават забойца — яшчэ дабрадзей.

Спрабуюць яго абяліць пасквілянты,
Выпрошваюць нават спагаду двара,
Таму найвышэйшая воля цара
Абрушыцца караю... на секунданта.

Забойцу ж... на мяккіх рысорах карэта
Памчыць пад ахову нянаскіх зямель,
Адкуль нават помста за гібель паэта
Не мае правоў выклікаць на дуэль.

А тут, дзе забойца быў ласкай прыгрэты,
Дзе сыпаў на раны нягойныя соль,
Навек застанецца нашчадкам паэта
Вялікі яго неадпомшчаны боль.

## Пушкінская бярозка

Відаць, не толькі для паэтаў,
Не для пацех ці першых слёз,
Нібы праклён самога свету,
Ён існаваў, фатальны лёс.

Яго бязлітасная жорсткасць
Ніяк яе не абышла,
Бярозку тую, што ў Трыгорскім
У парку Вульфавых расла.

Было даволі пані змераць
Нядобрым вокам — і... о, жах!
Як тут жа вострая сякера
Ужо заносіцца на ўзмах.
Нібы падстрэленая птушка,
Бярозка ўпала б у цішы,
Калі б не ён, выгнаннік Пушкін, —
Заступнік скрыўджанай душы.

Прэч адкідае ён гардыню
І просіць іменем сваім —
Не даць жывому дрэўцу згінуць...
І пакідае гаспадыня
Бярозку — памяццю аб ім.

Высокім станам, целам белым
Між дрэў здалёк была відна.
О, як жа буйна зелянела
Вясной, шчаслівая, яна!

Якую стоеную радасць
Дарыў ёй кожны сонца ўсход,
Дарыў датуль, пакуль са здрадай
Ён не прыйшоў, пракляты год.
Той год, што свету зло стварыў, —
Той год
Забіты Пушкін быў...
І ледзь смяротны стрэл дуэлі
З зямлі дайшоў, што крык тугі, —
Адразу ў небе пасмялелі
Раней прыціхлыя багі.

Сагналі чорным статкам хмары...
Спярша, як з вёдраў, лівень ліў,
Затым агнём пярун ударыў
І ўшчэнт бярозку спапяліў.

Відаць, не толькі для паэтаў,
Як цень няспраўджаных пагроз
І як праклён старога свету,
Ён існаваў, фатальны лёс.

*1974*

*Генадзь Бураўкін*

## У МІХАЙЛАЎСКІМ

Яшчэ драмала слава маладая,
А ён быў неаглядна малады, —
І толькі бомы з голасам Валдая
Сяброўскі ўздзіў прыносілі сюды.

Услед за ветрам бег ён летнім полем,
І кідаўся ў разліў пахучых траў,
І ўсім прысадам,
Сцежкам
І таполям
Па-царску бессмяротнасць раздаваў.

Ён тут блукаў у гордым задуменні.
Ён тут чакаў каханкі тайны крок,
Нястомны грэшнік,
Кучаравы геній,
Насмешнік,
Задзірака
І прарок.

Усе грахі яму даўно адпушчаны,
І дух ягоны ўзнесен на амвон...
Плыве,
Лунае над зямлёю Пушкіна
Усіх расійскіх храмаў перазвон.

*1995*

*Анатоль Вялюгін*

## ПУШКІН У БЕЛАРУСІ

Яшчэ не ўдарыў стрэл Дантэса,
Яшчэ ў прасторы не заціх
З Міхайлаўскага да Адэсы
Калёсны гром пракладных.

І, чуючы рачныя тоні
За прыдняпроўскім дубняком,
Храпуць узмыленя коні;
Клубіцца пыл над бальшаком.

Сыходзе ўбок жабрак пахілы,
Глядзіць паштовай тройцы ўслед...
Ад горкіх дум, а не ад пылу
Ў дарозе пасівеў паэт.

І тут, і тут царом распяты
Зямля і воля на крыжы,
І, як жабрак, з мальбою хаты
Глядзяць услед: — Дапамажы...

Мільгаюць хаты ў пыльнай веі
Ды паласатыя слупы.
Прыгонныя спяваюць жнеі,
Чужыя вяжучы снапы.

А песня то расінкай блісне,
То, як вяроўкаю тугой,
Жальбой раптоўна горла сцісне
І па шчацэ збяжыць слязой.

Фурман здзівіўся: “Вось дык барын,
Не стрэнеш гэтакіх, бадай.
Няўжо ў яго слязой на твары
Гарыць мужыцкая бяда?”

На смуглым твары — болю выраз
Ад горкіх дум, ад сумных спраў.
Фурман адчуў душою шчырасць
І, пасмялеўшы, запытаў:

— Калі ж, паночку, хмарай шэрай
Міне бяды і слёз пара?..
— Тады, як хрусне пад сякерай
Карона рускага цара...

Фурман перахрысціўся.
Коні
Рвануліся, нібы вятры.
Пад сонцам заблішчэлі тоні
І магілёўскія муры.

Сустрэне гэтак да Адэсы
Паэта не адзін начлег.
Яшчэ далёка стрэл Дантэса,
Крывавы вытаптаны снег.

. . . . . . . . . .

Фурман — мой прадзед — пра спатканне
Апавядаў пасля не раз.
Дайшоў да нас, нібы паданне,
Пра Пушкіна яго расказ.

*1949*

*Сяргей Грахоўскі*

## РАДНЯ

*5 жніўня 1824 года па дарозе з Адэсы ў Міхайлаўскае ссыльны Пушкін спыніўся ў Магілёве. Тут з радасцю яго сустрэлі прыхільнікі.*

Ад раніцы і да змяркання
Паміж лясоў, балот, пяскоў
З выгнання едзе у выгнанне
Паэт дарогаю на Пскоў.

На Беларусі спее лета,
Жывіцай дыхае з бароў,
І тут, здаецца, у паэта
Няма ні блізкіх, ні сяброў.

Ён ловіць кожны гук і слова
Жывой славянскай чысціні,
І замільгалі Магілёва
У змроку першыя агні.

Плывуць з Дняпра за хмарай хмары,
Гамоніць пастаялы двор,
І раптам статныя гусары
Яго здзівілі звонам шпор.

Пазналі, узнялі на рукі —
Не адкруціцца, не ўцячы.
І не змаўкаюць песень гукі
Да самай раніцы з начы.

Кіпяць і пеняцца бакалы,
Маланка б’е на ўсе бакі,
Грымяць вышэйшага напалу
Вольналюбівыя радкі,

І оду “Вольнасць” з хваляваннем
Чытаюць новыя сябры,
Пакуль малінавае ранне
Не занялося на Дняпры.

Пара выгнанніку ў дарогу:
Чакаюць коні і вазак,
Але гусары ля парога
Не развітаюцца ніяк.

Яго праводзяць да заставы
І пазіраюць доўга ўслед,
Здаецца шлях дарогай славы
І грозным волатам паэт.

А ён гайдаецца ў карэце
Пад песню жней насустрач дню
І знае, што на белым свеце
Ён мае блізкую радню.

*1974*

KAMUNIKAT.org

*Леанід Дранько-Майсюк*

## ПУШКІН

Не цягніце да Пушкіна прагныя рукі —
Не асвенціць іх сёмым крылом серафім.
Не лічыце паэта адно толькі рускім
І з прычыны такой назаўсёды с в а і м.

Не рабіце праз меру з яго дзекабрыста.
Не ўзбуйняйце паэтавы гнеў да цара...
І туману паменей на воблік празрысты,
І ялею паменей на твар песняра.

Гіменей прадракаў яму добрую долю —
Ён ні мужам, ні бацькам шчаслівым не стаў.
Апалон заклікаў да ахвяры святое —
Ён на заклікі тыя ўсур’ёз не зважаў.

З весялосцю сляпою ішоў да ахвяры
І трагічнасць нябачную нёс у душы,
Як дзіця, пра замежжа далёкае марыў,
Як дзіця, па глушэчы расійскай тужыў.

Думкі-мроі, што чыстай паперы прасілі —
Пад такім неспакойным і лёгкім пяром, —
Мелі клопат адзін: аб магутнай Расіі,
Самаўладнай Расіі з разумным царом.

Хоць і кляў самаўладцу ён і самаўладдзе,
Клікаў вольнасць, але жыў у часе сваім
І рабіў усё тое, што час яму радзіў,
Не пярэчачы наканаванню ні ў чым.

Пушкін быў манархістам і быў дэмакратам —
Гэткі Пушкін нязвыклы для догмаў-праграм,
Што курылі заўжды фіміямны парадак
Бенкендорфам сучасным і іхнім царам.

Не Дантэс, вінаваты паэт асабіста...
Не ў Дантэсавым стрэле, трагедыя ў тым,
Што паэт не забіў у сабе манархіста,
І вядома чаму — жыў у часе сваім.

І таму не ахоўвайце замілаваннем,
Не апраўдвайце ў нуднай сваёй чарадзе
Супярэчнасці генія, бо апраўданне
Не заўсёды да ісціны чыстай вядзе.

Адыдзіце, не рушце і позіркам музу,
Што спазнала, напэўна, найбольшы прымус...
Вам — Расія і Пушкін, а мне, беларусу,
І Расія, і Пушкін, і ўся Беларусь.

*1988*

KAMUNIKAT.org

*Міхась Калачынскі*

## ПУШКІН НАД ЛУЧОСАЙ

А́слаблі атосы...
Зляцелі супоні...
Паблізу Лучосы
Спыніліся коні.

Тракт сумны загушкаў
Паэта ў дарозе.
Прыпынак.
І — Пушкін
Ужо на Лучосе.

З чырвонай кашулі
Спадаў апаясак.
У ранішнім шуме
Луг выглянуў з красак.

Мярэжкамі пена
Плыла ля паэта.
Стажарыла сена
Прыгоннае лета.

Ён, зліты з ракою,
Красой яе, шумам,
Аддаўся над ёю
Журботлівым думам.

Спляталіся ў скрусе
Цяжкія расіны,
І лёс беларусаў,
І гора Расіі;

Мо склаліся б вершы,
Ды час — на раструску:
Зноў смутак ранейшы...
Зноў тракт беларускі...

Здарылася гэтак
Ці не на Лучосе,
Дапытвайце сведак —
Іх шмат засталося.

Гудзе яшчэ рэха,
Раскажа — злавіце, —
Як Пушкін тут ехаў
Да Пскова праз Віцебск.

Старыя лясы ўсе
Шумяць безупынку,
Як ён прыпыніўся
У нас на хвілінку.

*1961*

KAMUNIKAT.org

*Наум Кислик*

## ВСТРЕЧА С ПУШКИНЫМ

О как же,
как тут Пушкин хохотал,
арапски-белозубо,
звонко,
крепко.
Махнув на все приличья.
Падал в кресло.
Сгибался пополам и подлетал.
Аж над его курчавой головой
мелькали хвостовые перья фрака.
Но в этой вспышке не было, однако,
насмешки беспощадно гробовой.
Не вспомню точно —
время как в дыму, —
но я, тогда студент или учитель,
возьми да сдуру выложи ему,
кто у него
“типичный представитель”.
Я выпалил поэту сгоряча
все то,
что было должно по программе.
И тут портрет не удержался в раме
и вывалился на пол,
хохоча.
Он хохотал, хватаясь за бока...
Меж тем
я мысли брал не с потолка,
и чем отличны ямбы от хореев
и стих напевный от тактовика,
я знал,
как сам профессор Тимофеев.

Я тут же двойку Пушкину вкатал —
де, он отстал.
И он кивал согласно.
Де, глух остался к звукам ассонанса.
И он кивал.
И снова хохотал.
Как мнительность, что сокрушить врача
старается своим познаньем мнимым,
я поучал, клубясь надменным дымом.
И Пушкин соглашался, хохоча.
Аж стекла дребезжали за квартал,
не за квартал —
на расстоянье века.
А я — пока он воздух ртом хватал —
свое болтал
и удивлялся:
"Эко!"
И все ж во мне гвоздем засело эхо...
Оно во мне засело до того,
что вскакивать я начал среди ночи
и видеть пред собою тень его,
и явно слышать, что она —
хохочет.
Меня б режимом этим порешило,
но вовремя в моем подвздошье смех,
подложенный от бога, как на грех,
затикал, точно адская машина.
И рухнул я, сложившись пополам,
в присутствии его курчавой тени,
и, судорожно разгребая хлам,
стал дико хохотать.
Вовсю.
Как гений.

*1980*

*Валянціна Коўтун*

## НОЧ ПЕРАД...

Прарока сон і боль прарочы.
Але не ведаў Пушкін сам,
Чаму прачнуўся сярод ночы,
Адкрыўшы сэрца галасам.

А ноч праходзіла ў трызненні,
А ноч свіцілася даўно.
Усіх народаў пакаленні,
Ўсе церні глянулі ў акно.

Ці пугачоўца позірк сіні
Збудзіў паэта ў цішыні?
Не спіць прарок.
А на Расіі
Паўсюль раскладзены агні.

І інквізітары ў салонах,
Мундзіры царскага арла,
Яго штурхаюць з-пад калонаў
У пекла пошасці і зла.

Такі, як ён, заўжды ў апале, —
Любімец муз,
                    аўрор,
                              эпох.
Няўжо народы нараджалі
Сыноў любімых для галгоф?

Не спіць паэт.
А ноч, як дзёгаць.
Ўся Русь мужыцкая не спіць.
І востры,
          як Дантэсаў локаць,
У небе месяц зіхаціць.

А Пушкін...
Ён бяссонню рады, —
Вясёлы,
          дзёрзкі,
                    малады.
На аганёк яго лампады
Ляцяць планеты і гады.

Там цень Гамера і Атланты
Там косяць зорную траву...
І рукі, смуглыя піраты,
Ўжо кучаравяць галаву.

Тлусцелі хмары, як дуэнні.
Паэт пісаў,
          не зводзіў воч.
А ноч была перад дуэллю.
Бяссмерцем дыхала ўжо ноч.

*1984*

*Алег Лойка*

## ПУШКІН У МІХАЙЛАЎСКІМ

Фурман каня яму сядлае,
Ледзь адарваў ад мурагу...
Ён нецярплівіцца, ён лае
І варанога і слугу.

Ляціць — аж вецер хіжа свішча,
Каля азерца, край ракі,
Праз векавое гарадзішча,
Дзе сцежкамі, дзе напрасткі.

З вачэй — то боль і сум глыбокі,
То ўспышкі радасці, надзей.
Як мог, каня сцікаў пад бокі,
Ірвы, каменне — не глядзеў!

І гнаў таксама ж нестрымана,
Калі вяртаўся.
Цэлы свет
Ва ўсіх праявах нечуваных,
Ва ўсім абняць хацеў паэт.

“Мой, — Керн шаптала
ў захапленні, —
Незабывальны, дарагі...”
“Мой”, — абдымала за калені
Дачка прыгоннага слугі.

“Наш”, — казачна дубы шапталі,
Гулі вуркоціста грамы,
Вятры ў зарэччы паўтаралі...
І тое ж паўтараем мы.

*1967*

*Генадзь Пашкоў*

## У МІХАЙЛАЎСКІМ ДОЖДЖ

І лясы,
і пагоркі,
і млын на раўніне крылаты —
гэта ўсё,
нібы казку маленства, пазнаў.
У Міхайлаўскім дождж,
да бярвенца прамоклыя хаты.
Як брады
ў бяссмерце —
сцяжыны пад навіссю траў.

Што ж,
ідзі праз брады
у дрымучых алеяў гушчэчу,
спасцігай цішыню,
што такія бураны ўзняла.
...У Міхайлаўскім дождж,
як святло,
ападае на плечы.
Адзінокі вазок
выязджае на ўскраек сяла...

*1986*

*Пілip Пестрак*

## ПУШКІНСКАЯ ВОСЕНЬ

На полі ціш. Даўно пажаты нівы,
І даль мярэжыцца асенняю імглой,
Напевы дальнія, як бомы-пералівы,
Плывуць з далін над ціхаю зямлёй.

Міжволі хочацца заслухацца ў прасторы,
Адчуць свае дзіцячыя гады,
Дзе кожны паварот дарогі мне гаворыць
Аб пройдзеным, далёкім, маладым.

Не развітацца мне з таемным шумам сосен,
Што ўдаль глядзяць з курганнай вышыні,
Дзе ліраю звініць мне пушкінская восень
І будзіць спеўныя для сэрца думы-сны.

І любасць цёплая, як хмарка ў небе чыстым,
Плыве у сэрцы з пушкінскіх карцін, —
Той спеў дзяцінства ў вечар серабрысты
Кранае "Бурею" і "Вновь я посетил..."

Здалёку чую шум знаёмы сосен.
Нясу заветнае любові плынь
Да тых бяскрайніх, светлых далячынь,
Дзе ліраю звініць мне пушкінскія восень...

*1949*

*Давид Симанович*

## ТРОПОЮ ПУШКИНА

### Бильярдные шары

Шали, поэт, шали,
пока шалит метель.
Бильярдные шары
рука отправит в цель.

Сродни вину
                    угар
игры.
            Но бей не зря.
Есть цель другая —
                              царь
и ближние царя.

Шали, поэт, шали,
пока шалит метель.
Пусть строки,
                        как шары,
рука отправит в цель.

### Трость

То подбросит, то поймает, —
и, хозяину верна,
трость как будто понимает,
у кого в руках она.

А хозяин в это утро
сам с собой поговорит,
посмеется
                и кому-то
этой тростью погрозит.

А она —
и добрый посох,
и доброе перо,
а она —
мелькнет на росах —
и распишется хитро.

И ее сожмет в руке он,
проходя гнилой настил,
на пути к заветной келье
в Святогорский монастырь.

За оконцами пустыми
вдруг увидит наяву,
как дописывает Пимен
повесть древнюю свою.

И в глуши,
вдали от света —
не хозяин,
и не гость —
рад поэт,
что с ним все лето
неразлучна эта трость.

### Перед дуэлью

Как смешались
с утром вечер,
с полднем полночь,
с тьмою свет —
к черной бездне,
к Черной речке
торопил коней поэт.

Ранней позднью,
поздней ранью,
где-то рядом,
как вдали,
на гулянье ли,
с гулянья
проносилась Натали.

Поравнялись —
                         бог и кукла,
лоск ее,
               его чело.
Посмотрела близоруко,
не увидев ничего.

Да и он
                  глядел куда-то
мимо, мимо, мимо, ми...
Будто в чем-то виноват он
перед нею
                   и людьми.
Будто вечность остается
до дуэли на снегу —
до поры,
                  когда и солнце
будет у него
                         в долгу.

* * *

За годом год —
                          и век на марше
в цепях,
                  со звоном бубенца.

А няня Пушкину все машет
платочком с низкого крыльца.
А няня думает, наверно,
что и дуэль,
                      и красный снег,
и это время —
                           не навечно,
навечно
                только этот смех.
Его раскатистый, задорный,
его грешной —
                                 лети, лети
и опрокидывай заборы
между годами и людьми...

Двадцатый век
давно на марше,
срывая цепи,
множит свет.
И Пушкину
Отчизна машет
с крыльца высокого
вослед.

*1969*

KAMUNIKAT.org

*Максім Танк*

## У ДОМЕ А. С. ПУШКІНА

Калі я ўпершыню да поўначы зарніц
І да Нявы прыйшоў з палёў,
                                        дзе плешча Нёман, —
Я доўга тут стаяў, не мог пераступіць
Без самаго гаспадара парога дома.
Я з вечара яго да раніцы шукаў,
Пад веснавым дажджом,
                                        паўночным ветрам рэзкім,
І на ўзбярэжжы там, дзе медны конь скакаў,
І там, дзе палымнеў дарогай млечнай Неўскі.
Бо як паверыш ты ў бязлітасную смерць,
Адчуўшы сілу слоў яго, магутных, смелых,
Бо як паверыш ты, што абарваў свінец
Струну, якая так над светам прагучэла!
Дзень ленінградскі ўстаў і дзверы адчыніў.
Пайшоў народ у дом паэта дарагога.
Не, гэтак не ідуць, дзе нехта сном спачыў,
Так толькі людзі йдуць у госці да жывога.
І я ўвашоў у дом, дзе жыў, тварыў паэт,
Дзе прагучэў яго калісьці верш астатні,
Каб перадаць яму наш сонечны прывет
Ад беларускіх ніў
                                        і ўдзячных сэрцаў братніх.

*1949*

*Яўгенія Янішчыц*

## У ПАДАРОЖНУЮ А. С. ПУШКІНУ

І размінуцца немагчыма.
На Чорнай рэчцы белы лёд.
Ты падаў на шынель Айчыны,
А не на ўтоптаны сумёт.

У скрусе поле і дуброва.
І дзень, як чорны андарак.
Тваё параненае Слова
Імчыць задумлівы вазак.

Як цяжка дыхае свабода...
Ды ўсё ж не стоміць падарож,
Накорнейшы слуга народа
І воін полымны яго ж!

О не, не скончыліся спрэчкі,
Сыноў не зменелі рады,
Хоць чараты стаяць, як свечкі,
Над Чорнай рэчкаю журбы.

Ты ўсходзіш зноў, паплечнік славы,
Над тленам звадак і акоў,
Як лёгкі воблак кучаравы,
Як сонца вечнае вякоў.

*1987*

kamunikat.org